**Майстар-клас «Камп'ютарныя тэхналогіі ў рабоце педагога»**

**Т. У. Новікава,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» гімназіі № 3 г.Магілёва

**Мэта майстар-класа:** стварэнне ўмоў для развіцця педагагічнага майстэрства ўдзельнікаў шляхам абмену вопытам у ходзе прафесійнага ўзаемадзеяння.

**Задачы:**

- пазнаёміць удзельнікаў з электроннымі рэсурсамі па беларускай мове і літаратуры;
- абмеркаваць эфектыўныя формы работы з камп'ютарам, мультымедыяпраектарам і інтэрактыўнай дошкай у рабоце з адоранымі вучнямі;
- садзейнічаць выпрацоўцы эфектыўных прыёмаў выкарыстання ІКТ праз сумесную дзейнасць удзельнікаў майстар-класа;
- стварэнне спрыяльных умоў для самарэалізацыі ўдзельнікаў і стымулявання іх творчага патэнцыялу.

**Абсталяванне:** інтэрактыўная дошка, камп'ютар, прэзентацыя, раздатачны матэрыял.

**Ход правядзення майстар-класа**

**І этап. Арганізацыйны**

**Мэта этапу:** псіхалагічная гатоўнасць групы да заняткаў, арганізацыя ўвагі.

**Педагагічная задача:** арганізаваць і падрыхтаваць групу да работы.

| Дзейнасць майстра | Дзейнасць удзельнікаў |
|---|---|
| Арганізую ўвагу і запрашаю да супрацоўніцтва ўдзельнікаў. Абазначаю тэму заняткаў. | Унутрана арганізуюцца, мабілізуюцца на работу. |

**П этап. Арыентацыйна-матывацыйны**

**Мэта этапу**: гатоўнасць групы да атрымання новых ведаў, наяўнасць матывацыі.

**Педагагічная задача:** стварыць умовы для самавызначэння групы на пазнавальную дзейнасць і яе вынікі, для развіцця камунікатыўных навыкаў у працэсе ўзаемадзеяння.

| Дзейнасць майстра | Дзейнасць удзельнікаў |
|---|---|
| **2.1.** Прапаноўваю расшыфраваць абрэвіятуры ІКТ, ЭСН.<br>**2.2.** Прапаноўваю пісьмова на сцікерах працягнуць фразу: «Выкарыстанне ІКТ на ўроках беларускай мовы і літаратуры лічу мэтазгодным (немэтазгодным), таму што…»<br>**2.3.** Агучваю запісаныя варыянты і фармулюю тры важныя ўмовы паспяховай работы з ІКТ:<br>1) зыходзім з тэхнічных магчымасцей кабінета, у якім маюць адбыцца заняткі;<br>2) сочым за захаваннем санітарна-гігіенічных патрабаванняў;<br>3) памятаем, што ІКТ заклікаць аблегчыць працу настаўніка пры падрыхтоўцы і правядзенні заняткаў пры захаванні іх эфектыўнасці. | **2.1.**Удзельнікі расшыфроўваюць абрэвіятуры.<br>**2.2.** Запісваюць працяг фразы, выбіраючы патрэбнае слова і такім чынам вызначаючы свой статус адносна тэмы майстар-класа. Сцікеры замацоўваюць на дошцы.<br>**2.3.** Дапамагаюць рабіць абагульненні. Фармулююць мэту заняткаў (прааналізаваць прыёмы рацыянальнага выкарыстання ІКТ у рабоце з адоранымі вучнямі). |

**Ш этап. Аперацыйна-пазнавальны**

**Мэта этапу:** усведамленне ўдзельнікамі зместу прапанаванага матэрыялу, пазнавальная актыўнасць удзельнікаў.

**Педагагічная задача:** арганізаваць мэтанакіраваную пазнавальную дзейнасць удзельнікаў па засваенні новых ведаў, стварыць сітуацыю ўзаемадзеяння.

| Дзейнасць майстра | Дзейнасць удзельнікаў |
|---|---|
| **3.1.** Раблю агляд ЭСН па беларускай мове і літаратуры: праграмна-метадычныя комплексы, спецыяльныя CD-дыскі, матэрыялы сеціва, | **3.1.** Слухаюць паведамленне. |

| | |
|---|---|
| аўтарскія напрацоўкі.<br>**3.2. Прапаноўваю пытанне:**<br>**- *Якія фактары вызначаюць выбар таго ці іншага ЭСН для выкарыстання?***<br>**Выслухоўваю варыянты адказаў, падагульняю разважанні:**<br>- *Выбар ЭСН залежыць ад наяўнага абсталявання, ад мэты выкарыстання дадзенага матэрыялу на ўроку, ад тыпу ўрока, ад асаблівасцей класа, ад ступені падрыхтаванасці вучняў да канкрэтнага віду работы.* | **3.2.** Разважаюць над пытаннем. Даюць адказы. Дапамагаюць рабіць абагульненне. |
| **3.3. Прапаноўваю заданне для выканання па групах.**<br>*Уявіце, што ў вас з'явілася магчымасць скамплектаваць кабінет беларускай мовы і літаратуры. Якія тэхнічныя сродкі з прапанаваных ніжэй вы замовіце? Абгрунтуйце ваш выбар.*<br>Камп'ютар, аўдыясістэма, мадэм, мультымедыяпраектар з экранам, мультымедыяпраектар, інтэрактыўная дошка. | **3.3.** Дзеляцца на 4 групы (па нумарах), абдумваюць заданне, адзін прадстаўнік ад кожнай групы выступае з адказам. |
| **3.4. Арганізую работу ў групах па модулях.**<br>Размяркоўваю ўяўнае абсталяванне па групах наступным чынам:<br>1-я група – камп'ютар, аўдыясістэма;<br>2-я група – камп'ютар, аўдыясістэма, мультымедыяпраектар з экранам;<br>3-я група – камп'ютар, аўдыясістэма, мультымедыяпраектар з экранам, мадэм;<br>4-я група – камп'ютар, аўдыясістэма, мультымедыяпраектар, інтэрактыўная дошка. | **3.4.** Працуюць па наступным модулі, зыходзячы з «наяўнага» ў групы абсталявання.<br>1. Якія ЭСН вам спатрэбяцца?<br>2. Прадумайце аптымальныя формы работы з абсталяваннем |

<table>
<tr>
<td>Прапаноўваю кожнай групе даведачны матэрыял па адпаведным тыпе ўрока (з Інструктыўна-метадычнага пісьма МА РБ).<br>3.5. Запрашаю прадстаўніка кожнай групы прадставіць вынікі працы, запоўніўшы табліцу на інтэрактыўным слайдзе:<br>1-я група «Урок з камп’ютарнай падтрымкай»<br>2-я група «Урок з мультымедыйнай падтрымкай»<br>3-я група «Урок з выкарыстаннем рэсурсаў інтэрнэта»<br>4-я група «Урок з выкарыстаннем інтэрактыўнай дошкі»
<table>
<tr><td>Што выкарыстоўваем? (ЭСН)</td><td>Як выкарыстоўваем? (ІКТ)</td><td>Навошта выкарыстоўваем? (Мэта)</td></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td></tr>
</table>
Кожная наступная група дадае новае ў параўнанні з папярэдняй.</td>
<td>на ўроку.<br>3. Якой мэты дазволіць дасягнуць выкарыстанне ІКТ у гэтым выпадку?<br>3.5. Запаўняюць табліцы на слайдах. Суадносяць паняцці, робяць высновы.</td>
</tr>
</table>

**IV этап. Мадэліраванне**

**Мэта этапу**: стварэнне ў групах фрагмента ўрока з выкарыстаннем ІКТ.

**Педагагічная задача:** устанавіць усвядомленасць засваення інфармацыі папярэдняга этапу, стварыць умовы для эфектыўнай работы груп, стымуляваць удзельнікаў да развіцця творчага патэнцыялу.

| Мая дзейнасць | Дзейнасць удзельнікаў |
|---|---|
| **4.1.** Прапаноўваю напісаць фрагмент урока беларускай мовы (1-я група) або літаратуры (2-я група) з выкарыстаннем ІКТ. Тэма ўрока – вольная. Падзел на групы адбываецца пры дапамозе картак, на кожнай з якіх запісаны | **4.1.** Дзеляцца на 2 групы ў адпаведнасці з індывідуальнымі карткамі (дадатак 1). Працуюць над стварэннем фрагмента |

| | |
|---|---|
| канкрэтны ЭСН для выкарыстання на ўроку мовы або літаратуры (дадатак 1).<br>Дапамагаю ў выкананні задання.<br>**4.2. Арганізую аналіз вынікаў** дзейнасці і выканання кагнітыўных задач этапа па пытаннях.<br>*1. Ці задаволены вы вынікам сваёй работы?*<br>*2. Якія цяжкасці ўзнікалі пры стварэнні фрагмента ўрока?*<br>*3. Што дапамагала вам пераадолець гэтыя цяжкасці?* | ўрока з выкарыстаннем ЭСН. Прэзентуюць вынікі ад групы.<br>**4.2.** Звяртаюцца да вынікаў сваёй дзейнасці і робяць вывады. Ацэньваюць сваю дзейнасць, абазначаюць цяжкасці ў выкананні задання. |

**V этап. Рэфлексія і падвядзенне вынікаў**

**Мэта этапу:** усведамленне значнасці сумеснай дзейнасці.

**Педагагічная задача:** стварыць умовы для ўсведамлення ўдзельнікамі асобасных сэнсаў у набытых ведах і ўменнях, фарміравання індывідуальнай праграмы самаадукацыі.

| **Мая дзейнасць** | **Дзейнасць удзельнікаў** |
|---|---|
| Прапаноўваю пытанне: «Ці памяняўся ваш статус адносна магчымасцей выкарыстання ЭСН у рабоце з адоранымі вучнямі?» | Адказваюць на прапанаванае пытанне. |

**Дадатак**

| **Беларуская мова** | **Беларуская літаратура** |
|---|---|
| Прэзентацыя «Утварэнне і правапіс дзеепрыметнікаў» | Прэзентацыя « Жыццёвы і творчы шлях Аркадзя Куляшова » |
| «Сляпы» тэкст | Аўдыяспектакль «Насцечка» |
| Кластар з белымі плямамі «Сэнсавыя разрады прыметнікаў» | Фільм Віктара Турава «Людзі на балоце» |
| Камп’ютарны тэст «Правапіс літар е,ё,я» | Відэаўрок па творчасці Максіма Танка «Пясняр нарачанскага краю» |
| Інтэрактыўныя слайды «Скланенне назоўнікаў» | К амп’ютарны тэст « Жыццёвы і творчы шлях Яна Баршчэўскага » |
| Трэнажор «Правапіс лічэбнікаў» | Кластар з белымі плямамі «Асаблівасці рамантызму як творчага метаду» |
| Табліца «Тыпы асноў назоўнікаў» | Аўдыязапіс выразнага чытання верша Міколы Сурначова «У стоптаным жыце» |
| Алгарытм «Спражэнне дзеясловаў» | Слайды з ілюстрацыямі Валерыя Славука да беларускіх народных казак |
| Слайды з малюнкамі, падпісанымі па-руску | Аўдыязапіс голасу Янкі Купалы |
| ПМК «Сінтаксіс і пунктуацыя» | ПМК «Сусвет роднага слова» |

## ЛІТАРАТУРА


1. **Запрудский, Н. И.** Моделирование и проектирование авторских дидактических систем / Н. И. Запрудский. – Минск: «Сэр-Вит», 2008. – 336 с.
2. **Пахомова, Е. М.** Изучение и обобщение педагогического опыта / Е. М. Пахомова // Методист. – 2005. – № 2. – С. 29–33.
3. **Русская литература**: учеб. пособие для 5-го кл. общеобразоват. учреждений с белорус. и рус. яз. обучения. Часть 1 / Т.Ф. Мушинская, Е.В. Перевозная, С.Н. Каратай. – Минск: Нац. ин-т образования, 2009. – 176 с.
4. **Русский язык**: учеб. пособие для 6-го кл. общеобразоват. учреждений с белорус. и рус. яз. обучения / Л.А. Мурина [и др.]. – Минск: Нац. ин-т образования, 2010. – 272 с.
5. **Русских, Г. А.** Мастер-класс – технология подготовки учителя к творческой профессиональной деятельности / Г. А. Русских // Методист. – 2002. – № 1. – С. 38–40.
6. **Штейнберг, В. Э.** Дидактические многомерные инструменты: теория, методика, практика / В. Э. Штейнберг. – Москва: Народное образование, 2002. – 304 с.